**НУ І НУ!**

# Нацыянальную гісторыю не пускаюць у Нацыянальную бібліятэку?

Вонкавае аблічча галоўнай бібліятэкі краіны набыло акрэсленыя рысы, але дагэтуль незразумела, як будуць выглядаць яе інтэр'еры. Гэта тым больш дзіўна, што паставіць тэхнічнае абсталяванне і зрабіць мастацкае аздабленне будынка трэба да пачатку верасня. Сёння ж, зыходзячы з рэальнай сітуацыі, гаворка ідзе пра тое, каб паспець на момант урачыстага адкрыцця зрабіць хаця б што-небудзь; развесіць на сценах хаця б частку твораў, прадугледжаных генеральным планам.

Будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі выклікала салраўдны ажыятаж у мастакоўскім асяроддзі. Па-першае, браць удзел у "будоўлі стагоддзя" прэстыжна і ганарова. Па-другое, гэта перспектыва атрымання Дзяржаўнай прэміі. І, нарэшце, не апошняя рэч — грошы. Удзельнічаюць у афармленні будынка больш як трыццаць мастакоў, якія прадстаўляюць усе віды выяўленчай творчасці — жывапіс (манументальны і станковы), скульптуру, графіку, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Адбіралі людзей у гэтую групу без абвяшчэння конкурсу "на замяшчэнне вакантных пасад". Проста кіраўнікі творчых секцый Саюза мастакоў прадставілі ў Міністэрства культуры спісы тых, хто добра зарэкамендаваў сябе працай па аздобе такіх аб'ектаў, як Палац Рэспублікі, адбудаваная мінская ратуша, новыя аўта- і чыгуначны вакзалы сталіцы. І, што таксама немалаважна, здольных працаваць у аўральным рэжыме. Зразумела, што тыя, хто ў гэты спіс не трапілі, усчынілі вэрхал з патрабаваннем "празрыстасці". Але Міністэрства не звярнула на гэты крык душы ніякай увагі.

Дагэтуль не вызначана фінансавае пытанне. Ніводны мастак яшчэ не атрымаў ні капейкі, хоць кожная стадыя работы над творам (эскіз, кардон, рабочая мадэль...) на добры лад мусяць своечасова аплачвацца. Ні з кім не падпісаны дамовы. Мастакі кажуць, што ўсё трымаецца "на чэсным слове" адказных асоб. Міністр культуры, дарэчы, паводзіць сябе вельмі абачліва: усе паперы, датычныя аздаблення Нацыянальнай бібліятэкі, падпісваюць толькі ягоныя намеснікі.

Мастакі баяцца, што ў гэтай сітуацыі можа нечакана адбыцца перагляд усёй канцэпцыі аздаблення будынка. Маўляў, знойдзецца нехта, хто патлумачыць Рыгоравічу, што сёння ў Еўропе ў модзе голыя сцены, а значыць, ніякіх карцін, скульптур, фафічных аркушаў не трэба.

На дадзены момант нібыта вызначыліся толькі з ганарарнай "вілкай". Але і гэта зрабіць было няпроста. Напрыклад, рынкавы кошт графічнага аркуша можа вагацца ад 50 да 200 долараў, у залежнасці ад ступені вядомасці аўтара. Між тым прадстаўнікі гэтага мастацкага цэха хацелі аздобіць сцены новай бібліятэкі аркушамі коштам, эквівалентным... 5000 доларам. Прычым адзін толькі Георгій Паплаўскі быў гатовы "адшкадаваць" такіх аркушаў 20—30 штук (5000 долараў памножыць на 30...)- Зразумела, што ў чыноўнікаў, далёкіх ад мастацтва, але абавязаных лічыць дзяржаўную капейку, ад такіх прапаноў ледзь не "паехаў дах".

Адсутнасць уцямнай культурніцкай палітыкі люстэркава адбілася ў тэматыцы, на якую арыентуюць мастакоў. Гістарычная канкрэтыка адназначна не ўхваляецца. Ні табе Багушэвіча, Багдановіча, Гусоўскага, Сапегі... Не прайшоў цэнзуры Міхал Клеафанс Агінскі. (Адзінае выключэнне — даўно адлітая скульптура Францішка Скарыны перад уваходам.) Ніякіх сюжэтаў, якія падкрэсліваюць еўрапейскую сутнасць беларускай культуры, еўрапейскі змест беларускай гісторыі. Усё болей этнаграфія, прырода ды негеаметрышны абстракцыянізм...

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.**

